# «НЕ ПАКІДАЙ МЯНЕ»

***Пад такой назвай у актавай зале галоўнага корпуса нашага ўніверсітэта адбылася прэм'ера спектакля, прымеркаваная да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (па аднайменным творы беларускага драматурга Аляксея Дударава). Ролі выканалі навучэнцы Ліцэя ВДУ імя П.М. Машэрава.***



**Вадзім ПАХОЛАК, навучэнец 10 «М» класа:**

– Я выступаю на сцэне з ранняга дзяцінства. Гэта дапамагае мне забыцца пра праблемы і выпусціць эмоцыі. Мой персанаж – гвардыі капітан Пётр Кузьміч Міхасёў – чалавек, які валодае такімі станоўчымі якасцямі, як дабрыня, сумленнасць, мужнасць, адвага, адказнасць. Ён шмат чаго перажыў і мае вялікі жыццёвы вопыт, гатовы пайсці на ўсё, толькі б не змяніць сваім маральным прынцыпам. Мне было даволі лёгка ўжыцца ў ролю, да таго ж у нас вельмі прыемны і дружны калектыў, а таксама цудоўны кіраўнік. На маю думку, тэма вайны актуальна на ўсе часы, кожнаму варта памятаць пра подзвіг нашых продкаў. Падчас прэм'еры я не хваляваўся, бо адчуваў падтрымку блізкіх у зале і за кулісамі.

**Андрэй МАКЕЕЎ, навучэнец 10 «М» класа:**

– Для мяне гэта не дэбютнае выступленне на сцэне ў якасці артыста. Аднак у тэатральнай пастаноўцы такога маштабу і ўзроўню арганізацыі я прымаў удзел упершыню. Мой персанаж – палкоўнік – трохі суровы чалавек, які з разуменнем ставіцца да іншых людзей. І падчас рэпетыцый у мяне склалася адчуванне, быццам гэты вобраз быў напісаны менавіта пад мяне. Мне было цікава, вельмі спадабалася быць задзейнічаным у пастаноўцы на ваенную тэматыку. На рэпетыцыях, на якія мы збіраліся на працягу шасці месяцаў, з намі працаваў наш мудры рэжысёр Уладзімір Васільевіч, які ў любых незразумелых сітуацыях дапамагаў нам і заўсёды падтрымліваў. А калі я выступаў перад гледачамі, адчуваў лёгкае хваляванне і гонар за тое, што ў мяне была магчымасць удзельнічаць у такім спектаклі.

**Кіра АЎЛАСЕНКА, навучэнка 11 «Г» класа:**

– З самага дзяцінства я марыла звязаць сваё жыццё з музыкай або тэатрам, таму з маленства выступаю на сцэне. І па сённяшні дзень імкнуся ўхваціцца за любую магчымасць сыграць у спектаклі. Мая гераіня – Зіна Бацян – вельмі энергічная, баявая, эмацыянальная і гарэзлівая дзяўчына. Ад жахаў вайны яна імкнецца схавацца з дапамогай жартаў. Безумоўна, нярэдка Зіна агрызаецца, бывае дзёрзкай, але як персанаж яна мне вельмі падабаецца. Мне было лёгка ўжыцца ў ролю, усё ж такі ёсць у нас нешта падобнае: абедзве любім весялосць, досыць упартыя і запальчывыя. Я атрымала сапраўдную асалоду ад таго, што прыняла ўдзел у гэтай пастаноўцы, а таксама неперадаваемыя эмоцыі, калі выступала перад гледачамі, сярод якіх была і мая мама, якая спецыяльна прыехала ў гэты дзень у Віцебск, каб зрабіць мне сюрпрыз.

**Анастасія ГЕРАСІМАВА, навучэнка 10 «Б» класа:**

– Я не ў першы раз выступаю на сцэне, але ў такім спектаклі мне ўдзельнічаць яшчэ не даводзілася. Мой персанаж – Аля Ладысева – добрая дзяўчына з тонкай натурай і крыху запальчывым характарам. Мне было нескладана ўжыцца ў ролю, бо я сама вельмі падобная да сваёй гераіні. Гэта значыць такая ж спагадлівая, летуценная і калі чагосьці хачу, то зраблю ўсё, але даб'юся гэтага. Я не адчуваю асаблівага хвалявання падчас выступлення на сцэне. Але калі такое адбываецца, мне дапамагаюць дыхальныя практыкаванні. Калі гаварыць пра актуальнасць абранай ваеннай тэмы, то яна бясспрэчная. Думаю, нам удалося данесці ўсё, што мы хацелі, кожнаму гледачу ў зале.

**Анастасія ЗВЕРАВА, навучэнка 10 «Б» класа:**

– У якасці галоўнай гераіні я прымала ўдзел у спектаклі ўпершыню. Мой персанаж – Вераніка Крэміс – адказная і сціплая дзяўчына, якая выдатна спраўляецца са сваімі абавязкамі лейтэнанта. Мне падабалася хадзіць на рэпетыцыі, якія праходзілі вельмі цікава. Выдатны калектыў і добразычлівая абстаноўка натхнялі мяне на творчасць. Падчас прэм'еры я вельмі хвалявалася за кулісамі, але, калі выйшла на сцэну, максімальна пранікнулася гісторыяй сваёй гераіні, таму ўласныя перажыванні перайшлі на другі план. Для мяне было вельмі важна перамагчы свой страх выступлення перад публікай. У выніку я адчула захапленне і задавальненне ад таго, што ў нас усё атрымалася.

**Анастасія САЛАЎЁВА, навучэнка 10 «М» класа:**

– Раней я займалася ў некалькіх тэатральных студыях, дзе вывучала асновы тэатральнага майстэрства. Таму, калі мне прапанавалі стаць часткай дастаткова вялікага спектакля, я з радасцю пагадзілася. Мой персанаж – Ядвіга Гурская – какетлівая і крыху эгаістычная, але разам з тым вельмі смелая і самаахвярная дзяўчына. Нягледзячы на тое, што мы з ёй вельмі розныя па характары, мне было не цяжка ўжыцца ў ролю. Лічу, што у нас атрымаўся добры спектакль. Тэма вайны і жанчын на вайне не страціла сваёй актуальнасці. Нам, маладым людзям, нельга забываць пра жудасныя падзеі тых часоў, а таксама помніць і шанаваць подзвіг моладзі, што набліжала перамогу.

**Уладзімір ТРУШЧАНКА, дацэнт, выкладчык фізічнай культуры і здароўя Ліцэя ВДУ імя П.М. Машэрава, рэжысёр:**

– Мне вельмі блізкая гэтая тэма, бо ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны былі бацька (дайшоў да Германіі) і тры дзядзькі (загінулі). Рэпетыцый было дастаткова шмат, бо я як рэжысёр працаваў і з кожным артыстам асабіста, і з усімі разам. Адзначу, што навучэнцы ліцэя вельмі адказна падышлі да вывучэння асноў сцэнічнага майстэрства, спрабавалі максімальна ўжыцца ў ролю і адчуць эмоцыі і перажыванні сваіх персанажаў. І за гэта ім вялікі дзякуй. Таксама мае словы падзякі за дапамогу і падтрымку падчас падрыхтоўкі да спектакля дырэктару ліцэя Наталлі Уладзіміраўне Шчагловай, кіраўніку па ваенна-патрыятычным выхаванні Сяргею Аркадзьевічу Машэру, студэнтам 2 курса ФМіІТ Аляксандру Лазуку і Анатолю Старавойтаву, навучэнцы 11 «Г» класа ліцэя Валерыі Вішнеўскай. Спадзяюся, гледачы ў зале ацанілі намаганні юных артыстаў, якія ў гэты дзень не проста сыгралі, а пражылі свае ролі на сцэне.

**Вікторыя АЛЯКСАНДРАВА.**
**Здымак Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**

Фотарэпартаж са спектакля глядзіце з дапамогай QR-кода.